
Тэатр
шчасьлівых
дзяцей
Альгерд
Бахарэвіч

# Альгерд Іванавіч Бахарэвіч
# Тэатр шчасьлівых дзяцей

*Текст предоставлен издательством*
*http://www.litres.ru/pages/biblio_book/?art=65559606*
*Тэатр шчасьлівых дзяцей: Мінск; 2021*

## Аннотация

«Тэатр шчасьлівых дзяцей» – гэта беларускае фэнтэзі з элемэнтамі палітычнага трылеру. Дзіцячая кніга, якую, спадзяецца аўтар, будзе цікава прачытаць і дарослым. Як выбрацца з пасткі, ня маючы ні тэлефона, ні зброі, і знайсьці зьніклых сяброў? Колькі твараў у туману? Што такое гісторыя – і калі канчаецца мінулае? Якую таямніцу хаваюць нашыя бацькі – і ці чуе нас Бог, калі мы маўчым? Гэтымі пытаньнямі задаюцца героі кнігі, Лявон, Анцік і Юля, нечакана апынуўшыся ў таямнічым краі, які ня знойдзеш ні ў Вікіпэдыі, ні на школьных мапах.

# Содержание

Разьдзел першы 5
Разьдзел другі 16
Разьдзел трэці 38
Разьдзел чацьверты 51
Конец ознакомительного фрагмента. 60

# Ольгерд Бахаревич
# Тэатр шчасьлівых дзяцей
© Бахарэвіч А. І., 2021

# Разьдзел першы

І тут дзьверы адчыніліся.

«Вы чаго расшумеліся? – спытаў Кабінет Кабінетавіч, выходзячы са свайго цёмнага кабінета. – Толькі і чуваць, што вашыя дзікія крыкі».

І ён паглядзеў сваімі кабінетнымі вачыма спачатку на мяне, потым на Анціка. Але на мяне ўсё-ткі больш строга.

«Нейкія малпы, а ня дзеці», – сказаў Кабінет Кабінетавіч і павярнуўся, каб зноў схавацца ў сваім пакоі.

«Проста нам нудна», – нечакана сказаў гучным голасам Анцік. Мне ажно сорамна за яго зрабілася.

«Што? Нудна? Вам?»

Кабінет Кабінетавіч і праўда быў зьдзіўлены. І трошкі пакрыўджаны. Быццам глядзець на зачыненыя дзьверы ягонага кабінета было найлепшай забавай, якую можна сабе ўявіць.

«Так, нудна, – сказала Юля, выпаўзаючы з-пад канапы. – Нам нудна, і сумна, і нецікава, а яшчэ маркотна і тужліва. І яшчэ… І яшчэ журботна, вось».

Трымаючыся за ручку дзьвярэй, Кабінет Кабінетавіч разгублена абвёў нас вачыма. Спачатку мяне, потым Анціка, а потым Юлю. Аднак на Юлю чамусьці ён паглядзеў больш разгублена.

«Але ў вас ёсьць гэтыя вашы… – Кабінет Кабінетавіч задумаўся. – Гаджэты. Пляншэты. Тэлефоны. Кампутарныя

гульні. Цацкі. Мульцікі. Вы можаце сядзець за імі хоць да ночы. Я вам дазваляю. Рабіце ўсё што заўгодна, дзеці. Толькі не шуміце так. Галава ад вас баліць. А ў мяне яшчэ столькі працы».

І ён зноў павярнуўся, каб сысьці ў свой цёмны кабінет, пасярод якога сьвяціўся экран ноўтбука.

«А вось чаму, калі крычыш, у дарослых баліць галава?» – спытала Юля і чхнула. Нос у яе быў брудны, а на каленях чарнелі плямы ад пылу.

Кабінет Кабінетавіч агаломшана спыніўся на парозе і абярнуўся.

«Чаму? Як гэта чаму?»

«Ну вось чаму калі мы крычым, у вас галава пачынае менавіта балець? Чаму яна не пачынае, напрыклад, дыміцца? Ці падскокваць, як мяч?» – Юля заматляла галавой, быццам ненармальная, каб паказаць, як галава можа падскокваць на шыі. А потым падышла да Кабінета Кабінетавіча і паглядзела на яго зьнізу ўверх так, што ён ажно пабляднеў ад страху.

«Ну… – сказаў Кабінет Кабінетавіч і пацёр сабе нос. – Таму што. Таму што дзіцячыя галасы – гэта моцныя раздражняльнікі. Асабліва дзявочыя. У дзяўчат яны такія высокія, што нэрвовая сыстэма…»

«Ясна. Мы вас раздражняем, – сказаў я. – Прабачце».

«… такія высокія, што нэрвовая сыстэма чалавека мусіць на іх адгукацца, – сказаў Кабінет Кабінетавіч, прапусьціўшы мае словы міма сваіх кабінетных вушэй. – Калі я чую вашыя

крыкі, я пачынаю пра іх думаць. Толькі пра іх. І не магу засяродзіцца на сваёй працы. Я ні на чым больш не магу засяродзіцца. Разумееце, дзеці?»

«Не!» – сказалі мы хорам, хоць нам усё, абсалютна ўсё было зразумела. Атрымалася так голасна, што Кабінет Кабінетавіч ажно скрывіўся.

«Вось у мяне, напрыклад, калі нехта крычыць, пачынае балець палец, – сказала Юля. – На назе. Вось гэты».

І яна пачала здымаць шкарпэтку. Шкарпэтка не здымалася, і тады Юля задрала нагу і ўчапілася ў яе зубамі. Мне было за яе так сорамна, што я пачаў вырываць шкарпэтку ў яе з рота.

«А ў мяне, калі нехта крычыць, пачынае балець зуб, – сказаў Анцік. – Толькі яго ўжо вырвалі».

І ён падышоў да Кабінетыча, стаў перад ім на табурэтку і раскрыў рот так шырока, быццам сядзеў у зубнога. Кабінет Кабінетавіч толькі адхіснуўся і закрыў вочы рукамі.

А я нічога не сказаў. У мяне нічога не балела, таму што мае бацькі ніколі не крычалі. Ні на мяне, ні адно на аднаго.

«Карацей, займіцеся сваімі гульнямі і каб больш я ня чуў ніякага ляманту», – сказаў Кабінет Кабінетавіч, схаваўся ў сваім цёмным кабінэце і зачыніў за сабой дзьверы.

Мы чулі, як ён, крэкчучы, зноў усаджваецца за свой кампутар. За вокнамі было ўжо зусім цёмна. Але не настолькі, каб ісьці спаць. Мы селі на канапу, усе трое, і паклалі ногі на журнальны столік. І пачалі варушыць пальцамі. І чамусьці ў

нас гэта так гучна атрымлівалася, што падалося, зараз Кабінет Кабінетавіч зноў выскачыць са свайго пакоя.

«Давайце і праўда будзем цішэй, – прапанаваў я. – Мне яго неяк шкада».

«Каго? Кабінетавіча?» – спытаў Анцік.

«Ну так».

«Гэта таму што ў яго баліць галава, – сказаў Анцік. – Вось калі б у яго, напрыклад, балеў пуп, ніхто б і не заўважыў. І ён сам быў бы спакайнейшы».

«А давайце пагуляем у цішыню», – сказала Юля.

Яна надзьмулася і пачала маўчаць.

І вось мы маўчалі, маўчалі, маўчалі… Але хутка Юля ня вытрымала і як пырсьне сьлінай – проста на Анціка. Я таксама ня вытрымаў і зарагатаў, Юля за мной, а потым і Анцік ажно завыў ад сьмеху, як паранены воўк. З пакоя, дзе сядзеў Кабінет Кабінетавіч, пачулася пагрозьлівае рыпеньне. Я заціснуў Анціку рот, а Юля зноў папаўзла пад канапу, каб там удосталь насьмяяцца.

«А твае бацькі калі вернуцца?» – спытаў Анцік, аддыхаўшыся, калі я прыбраў руку.

«Толькі заўтра ўвечары, – сказаў я. – Яны паехалі за горад, на лецішча да мамінага шэфа. Але там сабакі, а ў мяне на іх алергія».

«А Кабінет Кабінетавіч? Ён хто?»

«Гэта сябар майго таты,» – нерашуча сказаў я.

Таму што ніколі раней пра яго ня чуў.

* * *

Кабінет Кабінетавіч зьявіўся ў нас сёньня пасьля абеду. Мама і тата папрасілі яго пабыць са мной, пакуль яны будуць у ад’езьдзе. Згорбіўшыся, не здымаючы свайго чорнага, мокрага плашча, ён увайшоў у нашу кватэру, падазрона пагляддзеў на мяне, прайшоўся па пакоях, зазірнуў у прыбіральню, адсунуў фіранку ў спальні…

«Цеснавата… А мне патрэбны кабінет, – сказаў ён, смурна разглядваючы мой стол, на якім валяліся кніжкі, алоўкі, выразаныя з часопісаў фоткі і фішкі з настольных гульняў. – У мяне шмат працы. У людзей маёй прафэсіі не бывае выходных. Але…»

Ён паглядзеў на мяне і пакруціў сваёй вялікай сівой галавой.

«Але?..» – з надзеяй спытала мама.

«Але калі ў мяне будзе свой кабінет, я, магчыма, змагу тут застацца. І паглядзець за вашым… Хм, сынам».

«Можаш працаваць у спальні, – сказаў тата. – Ніякіх праблем. Вось стол, вось крэсла».

«Лявон спакойны і выхаваны хлопчык, – сказала мама, якая ўжо даўно нафарбавалася. – Да яго сёньня прыйдуць сябры. Яны жывуць у суседнім доме. Праўда, Лявон? Ты ж чакаеш Анціка і Юлю? Дзеці будуць гуляць у сваім пакоі, а вы спакойна папрацуеце ў спальні. Лічыце яе сваім

кабінэтам. Вячэра ў лядоўні, абед на заўтра таксама. У нас мікрахвалёвая печка, Лявон умее зь ёй абыходзіцца. Ён зусім самастойны хлопец».

«Што ж, – сказаў Кабінет Кабінетавіч. – Спадзяюся, ён і праўда такі. І мне ня трэба будзе выціраць яму соплі, мазаць яго зялёнкай ці вучыць чысьціць зубы».

«А чым вы займаецеся?» – спытала мама.

«Ён піша раман», – сказаў тата, а Кабінет Кабінетавіч чамусьці пачырванеў і схаваўся ў ванным пакоі.

«Калі захочаце пакурыць, то на бальконе ёсьць попельніца», – гучна сказала яму мама і пацiснула плячыма. Я так і не зразумеў, чаму яна гэта сказала. Але Кабінет Кабінетавіч зь незадаволеным выглядам зноў зьявіўся ў калідоры. Мае бацькі не курылі, але часам да іх прыходзілі госьці. Некаторыя любілі падыміць на бальконе, і тады ў кватэру немінуча пракрадаўся пах цыгарэт: непрыемны і чужы. І я засынаў з гэтым пахам – быццам сам начаваў у гасьцях.

«Хм. Я нядаўна кінуў курыць, – сказаў Кабінет Кабінетавіч. – Таму для мяне цяпер надзвычай важна пазьбягаць стрэсаў».

«Усё будзе добра, – сказала мама. – У Лявона свае дзівацтвы, але дзейнічаць іншым на нэрвы – не, на гэта ён ня здольны».

«Гм! Спадзяюся», – зноў гмыкнуў Кабінет Кабінетавіч, з сумневам зірнуўшы мне ў вочы. Так, што я зразумеў: ён ні на каліўца ёй не паверыў.

А потым прыйшлі Анцік і Юля, мама пацалавала мяне ў лоб – і бацькі зьехалі. І, як гэта заўжды бывае, калі да цябе прыходзяць сябры, мне нават не было шкада, калі за мамай і татам зачыніліся дзьверы.

* * *

І вось мы сядзелі ўвечары на канапе: я, Анцік і Юля, і нам зусім не было чым заняцца. Мы ўжо згулялі ва ўсе настолкі, і ў уна, і фільм паглядзелі. І ў твістэр згулялі таксама. За акном ліў дождж і выў вецер, і дрэва пад самым нашым домам расшумелася так, нібы яму вельмі хацелася пра нешта нам расказаць. У мяне раптам узьнікла жаданьне ўзяць якую цікавую кніжку і забрацца пад коўдру – але ў мяне былі госьці. Няветліва забірацца пад коўдру з кніжкай, калі ў цябе госьці. Мама і тата ніколі не ляжаць у ложку пад коўдрай, калі да нас хтосьці прыходзіць. Наадварот, мама прыносіць цукеркі з сакрэтнай шафы, а тата дастае найлепшы каньяк. Цікава, дарэчы, пачаў разважаць я, чаму ў сьвеце ўсё так дзіўна прыдумана. Вось тата і мама – дарослыя людзі. Калі б я быў дарослы і ў мяне была жонка, і ў жонкі быў бы ключ ад сакрэтнай шафы – я б у халодныя вечары ляжаў зь ёй у ложку з кніжкай і еў цукеркі. А каньяк, мабыць, аддаў бы ёй, бо ён жа такі нясмачны – дарма што найлепшы. Тата зусім не разьбіраецца ў прысмаках.

Анцік і Юля пакрысе замоўклі, кожны думаў пра нешта

сваё. Дождж няспынна біў па гаўбцы, па падлозе папоўз халад, у нашым доме яшчэ не ўключылі ацяпленьне. Мы забраліся з нагамі на канапу. Дрэва за акном жаласьліва парыпвала гальлём – і я з тугой падумаў пра тое, што ў мамінага шэфа на дачы ёсьць камін і што яны сядзяць там проста цяпер, вялікая кампанія дарослых, з пухнатымі сабакамі, зь цёплымі пледамі, і ўсе п'юць віно, і ядуць печанае мяса, і можа, нават зьбіраюцца таньчыць. Калі бацькі сказалі, што мне нельга паехаць зь імі, я спачатку ўзрадаваўся, бо езьдзіць за горад з дарослымі такая нудота. А цяпер вось мне захацелася туды, да іх. Хай нават не зьвярталі б на мяне ўвагі, мне ўсё роўна, я б знайшоў чым заняцца. А ад алергіі ў мяне ёсьць лекі, іх жа для таго і прыдумалі. Чаму яны ня ўзялі мяне з сабой? Я нават ледзь не расплакаўся. Зірнуў на Анціка, потым на Юлю – не, на шчасьце, яны нічога не заўважылі.

«А давайце расказваць страшныя гісторыі, – сказаў Анцік. – Лявон, маеш чыпсы?»

«Якія ж страшныя гісторыі, калі чыпсы», – сказала Юля.

«А што?»

«Са страшнымі гісторыямі лепш за ўсё есьці сухарыкі», – патлумачыла Юля.

«Гэта яшчэ чаму?» – спытаў Анцік.

«Чыпсаў няма, – сказаў я. – І сухароў таксама. Ёсьць семкі».

«А давайце выцягнем Кабінетавіча зь яго нары. Выцягнем і паглядзім, што ён там піша, – прапанавала Юля. – Я пайду

схаваюся ў кухні і закрычу дзікім голасам. Як быццам мяне на кавалкі рэжуць. Кабінетавіч выйдзе паглядзець, пабяжыць на крык, а вы хутка скінеце на флэшку ягоную пісаніну і…»

«Не, – цьвёрда сказаў я. – Лепш ужо семкі».

«Добра, тады давайце гуляць у…»

І тут ва ўсёй кватэры раптам згасла сьвятло.

«У-у-у», – працяжна і радасна прагулі Анцік і Юля. А ў мяне аж сэрца ёкнула. Праўду мама кажа: я празьмерна ўразьлівы. Мо й добра, што ў пакоі зрабілася цёмна, хоць вока выкалі. Бо ні Анцік, ні Юля ня бачылі, як я здрыгануўся, калі ўсе лямпы раптам патухлі. І рукі ў мяне таксама задрыжалі, і пад сэрцам недзе заныла.

«Пробкі выбіла, – сказаў я важным голасам, каб яны не падумалі абы-чаго. – Пайду паглядзець. Хто са мной?»

Я баяўся, што яны не захочуць і давядзецца ісьці самому. Але яны дружна саскочылі з канапы. Мы пайшлі ў калідор, я намацаў у замку ключ і мы выйшлі на лесьвічную пляцоўку. Там таксама было зусім цёмна – толькі месяц у акенцы над сьмецьцеправодам кідаў слабы водбліск на мутнае шкло. Недзе далёка грымнула навальніца. Увесь пад’езд быццам ператварыўся раптам у глыбокі і гулкі цёмны калодзеж, і недзе ўсярэдзіне стаялі мы, натыкаючыся адно на аднога, як сьляпыя. Мне нават падалося, што пад нагамі ў нас булькае. Хоць гэта проста з даху вада лілася па вадасьцёках.

«Не, гэта ня пробкі, – сказаў я. – Ва ўсім доме сьвятло

вырубілася. Трэба сьвечкі запальваць».

Мы вярнуліся ў кватэру і ў густым змроку чарадой прайшлі на кухню. Я чуў, як у цемры гучна дыхаюць Анцік і Юля, і зразумеў, што ім таксама трохі вусьцішна. Адчыніўшы шафу на сьцяне, я пашукаў пальцамі па паліцы. Знайшоў сьвечкі, запалкі – і вось мы ўжо прабіраліся па калідоры, цікуючы за ўласнымі ценямі, што краліся ўздоўж сьценаў, як нейкія злавесныя манахі ў капюшонах.

«А як жа Кабінет Кабінетавіч?» – спытаў Анцік.

«І праўда, чаму ён не выходзіць?» – шапнуў я ўстрывожана, захінаючы далоняй агеньчык у маіх руках, каб ня згас.

«Можа, баіцца?» – сказаў Анцік.

«Ты што, ён жа дарослы, – сказала Юля. – У яго ноўтбук добра зараджаны, таму ён нічога і не заўважыў. Усё працуе, бедненькі. Давайце яго паклічам і скажам, што сьвятла няма».

Трымаючы перад сабой сьвечку, я ветліва пагрукаў у дзьверы бацькоўскай спальні. Але адтуль не пачулася ані гуку. Нібы Кабінет Кабінетавіч заснуў проста падчас працы.

«Адчыняй», – шапнула мне Юля. Трапяткое сьвятло сьвечкі скакала па яе твары.

«Неяк няёмка», – сказаў я.

«Тады я сама адчыню», – рашуча сказала Юля і прачыніла дзьверы. Яна выставіла наперад руку са сьвечкай і зазірнула ў пакой, а за ёй і мы прасунулі галовы. Я на хаду прыдумляў, што скажу Кабінету Кабінетавічу – што мы не хацелі, што

гэта ня пробкі, а падстанцыя, што я ўжо ўсё праверыў, і што такое ў нас часам бывае. Буду паводзіцца, як дарослы. Няхай Кабінет зразумее, што мама казала пра мяне праўду.

На стале, побач з ложкам маіх бацькоў, ярка сьвяціўся экран ноўтбука. Крэсла стаяла на сваім звычным месцы. Праз адчыненую фортку тхнула сьвежым сырым паветрам. Шумеў дождж, і недзе паблізу ў цемры рыпела старое дрэва. За акном, на вуліцы, каля аўтобуснага прыпынку, гарэў адзінокі ліхтар.

Але ніякага Кабінета Кабінетавіча ў пакоі не было.

# Разьдзел другі

«Ён што, праз фортку ўцёк?» – недаверліва сказала Юля.

Агаломшаныя, мы стаялі і азіраліся па баках.

«Я адразу падумаў, што ён няпросты дзядзечка», – сказаў Анцік.

«Просты, няпросты, але нельга ж так, – абурыўся я. – Дарослы чалавек, а паводзіцца, як дзіця. Дзе ён падзеўся?»

«Адзін Божанька ведае», – сказала Юля і чхнула, а потым выцерла пальцы аб покрыва на ложку. Думала, ніхто ня бачыць. Але мае вочы пачыналі ўжо паціху звыкацца зь цемрай, дый няяркае сьвятло ноўтбука дазваляла сёе-тое разглядзець. Напрыклад, раскладушку, якую бацькі паставілі каля сьцяны, а на ёй – бялізну і гару падушак. Пэўне, для Кабінетыча, калі той напрацуецца.

У бацькоўскай спальні я апошнім часам бываў рэдка, мне нельга было заходзіць сюды без дазволу. А цяпер, у цемры, гэты пакой наогул падаваўся мне нейкім незнаёмым. Я глядзеў на камоду ў куце і ня мог зразумець: яна тут заўсёды стаяла ці яны яе купілі, калі я ўжо вырас. Купілі і нічога мне не сказалі?

«Ну загадка!» – гучна сказаў Анцік, махнуўшы рукой, і ягоная сьвечка імгненна згасла. У пакоі адразу зрабілася яшчэ цямней – і мы неўпрыкмет прысунуліся бліжэй адно да аднога.

«Малайчына, – сказала Юля. – Хто ж дыхае на сьвечку ў такой цемнаце? Мог бы і памаўчаць, калі ня можаш сказаць штосьці разумнае».

Анцік гучна засоп, ён заўсёды так рабіў, калі пачуваўся пакрыўджаным і думаў, што б такога сказаць у адказ. Але цяпер нам было не да Анціка.

«Кабіне-етаві-іч!» – ціхенька паклікала Юля, узіраючыся ў цямрэчу калідора, і мы павярнуліся ўсьлед за ёй туды, але ніхто не адгукнуўся.

«Так ён цябе і пачуў», – помсьліва прамовіў Анцік.

І тут зусім блізка ад нас раптам нешта рыпнула. Нібы хтосьці хаваўся проста за адчыненымі дзьвярыма і толькі й чакаў, што мы яго паклічам. Мы скалануліся ад жаху. Нехта ззаду зьнянацку дакрануўся да маёй шыі – лёгка, халоднымі пальцамі… Я адчуў, як маё сэрца падскочыла, як мяч.

Фух. Фіранка. Вецер з адчыненай форткі ўзьняў яе край і кінуў у мой бок. Фіранка павольна апусьцілася, яе край зноў схаваўся за сталом, і я з палёгкай выдыхнуў.

«Там жа нікога няма, праўда? – сказаў Анцік, які стаяў побач са мной з заплюшчанымі вачыма. – Лявон, скажы, што мы адны ў кватэры!»

«Адны», – пачулі мы Юлін голас, і я вырашыў, што ня буду баяцца, што б ні здарылася. Усё ж я быў тут гаспадар. Хоць у хаце маёй было цяпер цёмна, як у труне.

«Зараз Кабінетавіч прыйдзе, і ўсё зробіцца добра. Падумаеш, у прыбіральню чалавек выйшаў на хвілінку», – сказа-

ла Юля, а сама ўзяла мяне за руку, каб не баяцца, і рука ў яе была ледзяная.

«Можа, ён выйшаў, калі мы пробкі правяраць хадзілі? – здагадаўся я. – Пайшоў нас шукаць. Зараз вернецца і…»

Мы ўсе разам павярнуліся да дзьвярэй, але ў кватэры цяпер была мёртвая цішыня. Нават супэрсучасная супэрбясшумная і супэрэканамічная лядоўня, якую нядаўна купілі бацькі, маўчала – хоць раней я чуў яе нават празь дзьве сьцяны. Зразумела чаму. Электрычнасьць жа вырубілася.

«А можа, ён затаіўся недзе і чакае? Гэты Кабінетавіч? Мы выйдзем, а ён як накінецца ў цемнаце?» – прашаптаў Анцік.

«Навошта гэта яму на нас кідацца?» – недаверліва спытала Юля.

«Ну, каб пажартаваць».

«Не, Кабінетавіч не такі чалавек, – сказаў я. – Ён жа раман піша. Адкуль яму ведаць, што такое жарты».

«Раман? – перапытаў Анцік. – А што гэта?»

«Ну, – сказаў я важна, хоць сам цьмяна сабе ўяўляў, што гэта такое. – Ну… Гэта такая вялікая кніга для дарослых. Вельмі тоўстая і сур’ёзная. Дзе апісваюцца розныя героі. І што яны думаюць».

«А пра што яны думаюць?» – не адчапляўся Анцік.

«Пра што захочуць, пра тое і думаюць, – раззлаваўся я. – Якая розьніца. Вырасьцеш, даведаешся».

«Ці спытаеш у Кабінетыча, – падтрымала мяне Юля. – Калі ён знойдзецца. Толькі наўрад ці ён захоча з табой раз-

маўляць. Ты ж наймалодшы з нас, забыўся?»

Анцік зноў засоп. Мне раптам зрабілася яго шкада.

«Слухайце, – сказаў я. – Мне гэта не падабаецца. Мы так пасварымся хутка. І без усялякай прычыны. Такі дзень быў файны. І вось табе маеш. Вы заўважылі, як у нас настрой зьмяніўся? Усе нейкія злосныя зрабіліся…»

«Гэта таму што цёмна, – сказаў Анцік. – І есьці ўжо хочацца. Ты казаў, там на кухні семкі? Юля, ты такая сьмелая, можа, сходзіш хуценька?.. Туды і назад? А?»

«Давайце я бацькам патэлефаную, – вырашыў я. – Пацерпіш».

Мы выйшлі зь цёмнай спальні, я навобмацак знайшоў сярод падушак на канапе свой мабільны і набраў тату, але ён не адказваў. Тады я набраў маму, але і яна не падняла трубку. Напэўна, і праўда таньчаць там, на лецішчы. Уключылі музыку на ўсю катушку – вось і ня чуюць. Бацькі, называецца. Забаўляюцца сабе недзе за горадам, а пра сына і забыліся. Мой тэлефон, між іншым, амаль разрадзіўся, а электрычнасьці не было. Вось захочуць мне пазваніць, праверыць, як я тут маюся, ці жывы, ці дыхаю яшчэ, а ня змогуць. Можа, я тут у лужыне крыві даўно валяюся. Ці алергія пачалася. Хай тады свайму Кабінетавічу тэлефануюць. Таму самаму Кабінетавічу, які загадкава зьнік і ніхто ня ведае, дзе яго шукаць. Кінуў нас адных. А яшчэ дарослы чалавек. Раманіст. Ну окей. Хай тады бацькі кусаюць локці. Самі яго паклікалі. Я б і безь яго спакойна пераначаваў. Не маленькі.

Анцік і Юля, ледзь бачныя ў цемры, моўчкі сачылі за маімі спробамі дазваніцца. Я чуў, як яны напружана дыхаюць.

«Вам, мабыць, дахаты пара, – спахапіўся я, зірнуўшы на гадзіньнік свайго мабільнага. – Юль, твае бацькі, відаць, ужо хвалююцца. І твае, Анцік. Вас жа толькі да дзевяці адпусьцілі, а ўжо дзясятая гадзіна».

І зноў мой голас задрыжаў. Бо, шчыра кажучы, сёньня мне зусім не хацелася заставацца на ноч аднаму ў пустой і цёмнай кватэры. І нават калі б сьвятло ўключылі – хто захоча начаваць у адзіноце пасьля такіх дзіўных здарэньняў.

«Слухай, Лявон, – сказала Юля, нібы прачытаўшы мае думкі. – Я лічу, цябе нельга пакідаць тут аднаго. Зараз я сваім бацькам пазваню і скажу, што застануся ў цябе да раніцы».

Я з сумневам паглядзеў у той бок, дзе яна сядзела. Яе твару не было відаць, але я бачыў, як бялеюць у цемры зубы. Яна што, усьміхалася?

«Але бацькі цябе не адпусьцяць, я іх ведаю», – сказаў я і ўздыхнуў.

Рэч у тым, што Юліны бацькі верылі ў Бога. Божанька ўсё бачыць, расказала нам неяк Юля, і няясна было, яна сама так думае ці ёй трэба так думаць, каб бацькі на яе не сердавалі. Як гэта ўсё ж складана: жыць, верачы ў Бога. Калі ня можаш нікуды схавацца, нават на хвілінку. Вось мае бацькі, напрыклад, лічылі, што ў дзіцяці павінен быць свой пакой. А ў Юлі свайго пакоя не было. То бок ён быў, канечне, але

які ж гэта свой пакой, калі з табой увесь час жыве Бог. Нібы старэйшы брат ці сястра. А яшчэ Бог чамусьці не любіў, калі Юля начавала ня дома. І хоць яна ніколі гэтага не рабіла, Бог усё роўна быў супраць.

Цікава, падумаў я: калі Бог і праўда існуе, ці бачыць ён у цемры? Што ён бачыць, калі ў кватэры выключаецца электрычнасьць? Ці бачыць ён нас? Я ўпотай пакалупаўся пальцам у носе, але Бог пакуль што прамаўчаў. Можа, не заўважыў проста. А можа, убачыў і запомніў. І паставіў птушку насупраць майго імя. Калі Юліных бацькоў паслухаць, неяк так ён і дзейнічае. Запамінае, хто чаго нарабіў – а потым бабах. У самы неспрыяльны момант.

«Я таксама пазваню і адпрашуся! – заявіў Анцік. – Тут такая таямніца, а я што, спаць мушу ісьці? Знайшлі дурнічку!»

«Ну, цябе ўжо дакладна не адпусьцяць, – сказаў я. – Цябе нават у лес з намі тады не адпусьцілі, памятаеш? Калі я руку зламаў».

«А, гэта калі Юлю міліцыя да ночы з сабакамі шукала? – сказаў Анцік. – Дык гэта яшчэ ў дзяцінстве было. Знайшоў што ўспомніць».

«Эх, цудоўны быў час, – сказала Юля. – Добра. Зараз я сваім пазваню. Штосьці прыдумаем».

Дзіва дзіўнае. Я б і не паверыў, калі б не сядзеў поруч. Юліны бацькі дазволілі ёй застацца ў мяне да раніцы! Юля і сама зьдзівілася, як лёгка яны пагадзіліся. «Такое адчуваньне было, што яны ўжо даўно сьпяць, – уздыхнула яна. –

Нейкі сонны голас у таты… Нібы і не ягоны. А потым гэтыя людзі будуць казаць, што за мяне хвалююцца. Ага, як жа ж».

Вядома, яна ні слова не сказала сваім бацькам пра тое, што ў нашым доме няма сьвятла. Але хіба яна схлусіла? Не, пераконваў я сябе. Яна проста не сказала. А гэта зусім іншая рэч, чым схлусіць. Схлусіць – значыць сказаць няпраўду. А не сказаць няпраўду – значыць сказаць праўду. То бок Юля сказала ім праўду, што хоча застацца ў мяне пераначаваць, і не сказала ім няпраўду, што мяне пакінулі дома ў самоце, бо якая ж гэта самота, калі мяне пакінулі з Кабінетам Кабінетавічам. Натхнёны лягічнай хадой сваіх думак, я пакрысе супакоіўся і вырашыў узяць стырно ў свае рукі.

«Толькі не хлусі», – строга сказаў я Анціку перад тым, як ён сеў званіць.

«І не сапі ў трубку, – сказала Юля. – А то яны падумаюць, мы табе тут нож да горла прыставілі».

І вось мы селі бліжэй да Анціка і напружана сачылі, як ён набірае нумар.

«Усё добра, мам, – прасоп Анцік, прыціскаючы тэлефон да вуха. – Нармальна, ага. Паелі. Ага. Мам? А гэта праўда ты?»

Мы зьдзіўлена зірнулі на Анціка. Як можна пра такое пытацца ва ўласнай маці?

«А можна… – лісьліва сказаў Анцік. – Мам, а можна мне застацца ў Лявона? Да раніцы? Ура! Дабранач!»

Ён кінуў тэлефон на падушку.

«Гэтага проста ня можа быць», – сказаў я.

«Чаму?» – спытаў Анцік.

«Таму што я ведаю вашых бацькоў. Яны б ніколі не дазволілі вам начаваць у мяне. Нават калі б яны не былі супраць, сказалі б: паклічце спачатку да тэлефона кагосьці з дарослых».

«Але бачыш, Лявон, усё скончылася добра, – сказала Юля. – Мы з табой. Сьвятла няма, затое ёсьць загадка. Куды падзеўся Кабінет Кабінетавіч? Прапаную вярнуцца ў яго кабінет і ўсім разам добра падумаць!»

Па чарзе, стараючыся не азірацца, мы зноў прайшлі па цёмнай кватэры ў спальню маіх бацькоў. Ноўтбук на стале ўсё гэтак жа сьвяціўся ў змроку, а за акном гарэў ліхтар, але ён быў на іншым баку вуліцы, далёка ад нас. Далёка, як поўня, падумаў я. Хоць якая поўня ў такое надвор'е.

«Давайце адчынім акно, – сказаў я. – Гэта адзіны шлях, якім ён мог уцячы. Паглядзім, ці не засталося сьлядоў».

І хоць насамрэч сьмешна было ўяўляць Кабінетавіча, які лезе праз фортку, прасоўваючы ў такую вузкую адтуліну сваё даўгое цела, я ўзяўся за справу грунтоўна. Стаў на крэсла, дацягнуўся да верхняга шпінгалета, вольнай рукой адчыніў акно і вызірнуў вонкі, у дождж.

І тут мая сьвечка таксама згасла. Я палез па запалкі, але ў кішэні іх не было. Пэўне, згубіў на канапе, выпалі, ці што. Калі б не ноўтбук на стале, які асьвятляў твары Анціка і Юлі, і ня сьвечка ў Юліных руках, я б наогул ня бачыў, што адбы-

ваецца за маёй сьпінай, у маёй роднай кватэры. Дый перада мной была непраглядная ноч. Толькі самотны ліхтар у смузе – і ноч.

«Ну што там?» – хорам запыталіся Анцік і Юля.

«Нічога, – сказаў я. – Цемра».

На другім баку нашай вуліцы быў прыпынак, на якім спыняўся толькі адзін аўтобус, дый той хадзіў рэдка. Мала хто ім езьдзіў, бо маршрут у яго быў нейкі дзіўны. Тата шмат разоў казаў, што пара ўжо скасаваць такі непапулярны маршрут. На прыпынку цяпер не было нікога, і ходнік таксама быў пусты. Здавалася, з гораду ўсе сышлі кудысьці, а нас не папярэдзілі. Сышлі і распусьціліся ў тумане. Дарослыя, дзеці, жывёлы. Усе. Засталіся толькі мы трое, зачыненыя ў цёмнай кватэры, і гэты цьмяны ліхтар на вуліцы сярод дажджу.

Я зірнуў уніз, але не пабачыў нічога. Мы жылі на другім паверсе – і, стоячы на падваконьні, я ведаў, што там, у цёмнай прорве пада мной, чорная мокрая трава, засохлы кветнік і поўныя дажджавой вады місачкі для катоў, якіх карміла суседка зьнізу, ведаў, што там ляжаць недапалкі і сьмецьце, і што калі ісьці па вуліцы ўлева, дык прыйдзеш да крамы, а калі ўправа, дык да школы.

Але цяпер там была толькі цемра. Тая самая цемра, якой некалі баяліся першабытныя людзі – і таму прыдумалі агонь.

«Высакавата, – сказаў я. – Нават для Кабінетыча. Я б дакладна не рызыкнуў».

«Ня ведаю, як вы… – сказала Юля і села за стол. Цяпер

сьвечка гарэла толькі ў яе, і яна пачувалася галоўнай. – А я ду-ужа хачу пачытаць, што ён там пісаў. Што там за раман такі».

«Ты што? – сказаў я, саскокваючы на падлогу. – Хіба можна чытаць чужое?»

«Можа, у ім разгадка? – сказала Юля. – Можа, Кабінетавіч там напісаў пра свае пляны. Куды ён падзеўся і дзе яго шукаць. І наогул, калі ён піша гэты свой раман, значыць, хоча, каб яго прачыталі. Інакш навошта яму наогул яго пісаць?»

Яна паставіла сьвечку на стол і зручней уладкавалася ў крэсьле. Мы з Анцікам сталі абапал яе і ўпэрыліся вачыма ў экран. Файл з раманам Кабінетыча доўга шукаць не давялося, ён там быў толькі адзін, проста на працоўным стале. І назва ў файла была такая, што не пераблытаеш:

*раман. docx*

Юля адчыніла файл, і мы не паверылі сваім вачам.

На экране было ўсяго толькі тры словы!

Усяго тры.

«Ну нічога сабе», – расчаравана сказала Юля.

«Вялі-ікая, то-оўстая кніга… – перадражніў мяне Анцік. – Ён што, цэлы вечар тут сядзеў, каб напісаць тры словы?»

«Адкуль мне ведаць, – сказаў я. – Можа, у яго не ішло. Ты і столькі не напішаш, калі цябе пасадзіць раман пісаць».

«Напішу! – сказаў Анцік. – Я табе такі раман за сэкунду напішу, нават большы, чым у Кабінетыча!»

«Мне вось што цікава… – сказаў я, бо і праўда ня мог дапяць, што адбываецца. – Усе прачыталі, што тут напісана?»

«Гэта не па-нашаму», – сказаў Анцік.

«І гэта не па-ангельску, – сказала Юля. – Нейкія незразумелыя літары».

«Вось! – сказаў я. – Гэта шыфр. Наш Кабінетыч пісаў шыфрам. А гэта значыць…»

«Гэта значыць, ён пісаў тут зусім не раман», – хутка прамовіла Юля. – Ён усіх падмануў.

«Не раман? А што тады?»

І тут у дзьверы пазванілі – рэзка і настойліва!

Я нават падумаць ня мог, што наш добры дзьвярны званок можа так жудасна гучаць. Нібы піла.

Юля ажно падскочыла ў крэсьле, а мы з Анцікам кінуліся ў розныя бакі.

Званок яшчэ раз разьдзёр цемру кватэры, а потым зрабілася ціха.

«Юля! Анцік!» – паклікаў я шэптам, седзячы за ложкам.

«Я тут», – азваўся Анцік аднекуль з-за камоды.

«А я тут», – ціха сказала Юля. Я падняў галаву і пабачыў, што яна ўсё гэтак жа сядзіць за сталом. Можна было падумаць, што ёй зусім ня страшна, але я бачыў, як яна ўчапілася ў падлакотнікі – быццам яе спрабавала выцягнуць адтуль нейкая невядомая сіла.

«Спужаліся? – шапнула Юля. – Я таксама».

«Дзіўна, – сказаў я. – Электрычнасьці няма, а званок пра-

цуе…»

«Як такое можа быць?» – усхліпнуў Анцік.

«Ты што, плачаш?»

«Я? Я ніколі ня плачу! Гэта проста соплі», – шмыгнуў носам Анцік, высунуўшыся з-за камоды.

«Можа, там на пляцоўцы Кабінет Кабінетавіч? – сказаў я. – Можа, ён ключы забыўся?»

«Давайце адчынім!» – узрадаваўся Анцік.

«Не, – сказала Юля. – Трэба спачатку схадзіць на разьведку. Толькі ціха!»

Яна спусьцілася на падлогу і стала на кукішкі. Я нехаця зрабіў тое самае, а потым і Анцік вылез са свайго ўкрыцьця. І мы папаўзьлі ў калідор, а адтуль да дзьвярэй.

«А чаму мы паўзем? – спытаў Анцік. – Маглі б проста…»

«А раптам нехта глядзіць у вокны? – сказала Юля. – Толькі і чакае, што мы сябе выдадзім».

«Хто?» – прашаптаў з жахам Анцік.

«Ты што, кніжак не чытаеш? – спыніўся я, павярнуўшы да яго галаву. – Можа, яны думаюць, што нікога няма дома. Ці што тут дарослыя. А калі даведаюцца, што тут дзеці…»

«Хто даведаецца? – ледзь не расплакаўся Анцік. – Хто? Лявон, скажы, хто?»

«Гэтага мы ня ведаем. Усё, маўчы».

Мы дапаўзьлі да дзьвярэй і прыслухаліся. Спачатку нічога не было чуваць, але калі маё сэрца трохі суцішылася, я зразумеў, што радавацца рана. Там, на пляцоўцы, нехта быў,

нехта чакаў і дыхаў, стоячы проста перад дзьвярыма – і таксама прыслухоўваўся, спрабуючы нас пачуць.

«Можа, усё ж адчыніць? – прашаптаў Анцік. – Можа, гэта мае бацькі? Або Юліны?»

«Не, яны б пазванілі спачатку, – адказаў я таксама шэптам. – Давайце пачакаем, ён пастаіць і сыдзе».

Але той, хто стаяў за дзьвярыма, не сыходзіў. Замест гэтага ён яшчэ раз пазваніў – доўгім, пранізьлівым званком, ад якога ў мяне зноў закалацілася сэрца.

«Хто там?» – раптам сказаў Анцік сваім гучным голасам, якім ён славіўся на ўсю школу. Юля схапілася за галаву, але прамахнулася і трапіла мне ў нос. Я ўскрыкнуў ад болю – і, вядома, адразу выдаў сябе.

«Гэта ваша суседка, – радасна, нібы толькі і чакаў, прамовіў з пляцоўкі нечы тонкі голас. – У вас таксама сьвятла няма?»

«Няма», – сказаў я.

«Вось жа паскуднікі, – залапатаў тонкі голас. – Надакучылі ўжо сваімі аварыямі! За што мы толькі грошы плацім! А вы ня ведаеце, гэта ва ўсім раёне няма, ці толькі ў нашым доме?»

«Гэта падстанцыя», – сказаў я няўпэўнена. Я ня ведаў, што значыць «падстанцыя», але так казаў тата, калі ў доме здараліся гэткія адключэньні.

«Пакліч некага з дарослых, – сказаў голас. – Я б пазычыла ў вас сьвечку і запалкі, бо ў мяне яны скончыліся, а з маім

зрокам хадзіць па цёмнай кватэры проста небясьпечна».

Усё гэта гучала, здаецца, цалкам пераканаўча, і я ўжо пацягнуўся да замка, каб павярнуць у ім ключ. Але ў апошні момант перадумаў. Бо ў гэтым тонкім голасе была нейкая незразумелая, злая радасьць і нецярплівасьць. Нібы тая, што была на пляцоўцы, сама і адключыла электрычнасьць.

«Ну адчыняй жа», – сказаў голас і ручка дзьвярэй раптам заторгалася проста ў мяне перад носам. Юля і Анцік ускочылі – іхныя твары былі вельмі блізка, і я бачыў, што яны круцяць вачыма, каб я ні ў якім разе не адчыняў.

«Мы ўжо сьпім», – сказаў я, ня ведаючы, што рабіць.

«Як жа сьпіце, калі ў вас сьвечка ў спальні гарыць», – сказаў голас.

«А адкуль вы ведаеце?» – спытала Юля.

«Інтуіцыя, – прамармытаў голас. – О, я чую, што вас там трое. Трое дзяцей і ніводнага дарослага?»

«Мама і тата сьпяць, – сказаў я. – Я ня буду іх будзіць».

«Бедныя дзеці, адны ў цёмнай кватэры, – сказаў голас і мне падалося, гэта было сказана з усьмешкай. – Страшна, напэўна, сядзець там у цемры? Адчыніце, я пасяджу з вамі, пакуль вы адны. Мы запалім сьвечкі і прыгатуем штосьці смачнае, напрыклад, маркоўны пірог. Зварым глінтвэйн і будзем расказваць страшныя гісторыі. І я буду гладзіць вас па галовах. А потым вы засьняце, а калі прачняцеся, на вуліцы будзе ўжо сонечна, і вы забудзеце ўсё, што адбылося. І кожны з вас вырасьце разумным і сьмелым, багатым і пасьпяховым…

А потым вы ажэніцеся і ў вас будуць дзеткі… Калі, вядома, вы адчыніце мне зараз дзьверы і пусьціце пасядзець з вамі, і перастанеце ўпарціцца! Хіба вас гэтаму вучылі: кідаць блізкіх сваіх у бядзе?»

«Мы не адны, – сказала Юля. – У нас Кабінет Кабінетавіч сядзіць у кабінэце і піша раман. Вось зараз паклічам яго, і ён вам пакажа, як пужаць дзяцей».

«Ох, дзетачка мая, – адказаў голас. – Думаеш, калі б у вас дома былі дарослыя, яны б дазволілі вам стаяць каля дзьвярэй і размаўляць з суседзямі? Гэта зусім не дзіцячая справа».

«А чаму б вам не пазваніць у суседнюю кватэру? – спытаў я. – Там вам адчыняць і пазычаць сьвечку. А нас пакіньце ў спакоі, калі ласка. Я зараз у міліцыю пазваню».

«А ты няветлівы хлопец, – цяпер ужо злавесна сказаў голас. – У міліцыю… Ну пазвані, пазвані. Калі пасьпееш!»

І тут ручка дзьвярэй нібы ашалела, яна заторгалася, нібы жывая, яна рвалася і ляскала, яна вішчала і білася ў замку, быццам хацела скінуць яго зь сябе, як шкарлупіньне.

Мы кінуліся ў мой пакой і забіліся за канапу.

«Званю ў міліцыю! – прашаптаў я. – Пакуль ня позна!»

Я намацаў на канапе тэлефон і пачаў набіраць лічбы, але з жахам пабачыў, што апарат ужо зусім разрадзіўся.

«Можна адаслаць бацькам паведамленьне па інтэрнэце! – прашаптала Юля. – Ой, што гэта? Чуеце?»

Мы вызірнулі з-пад канапы. Недзе паблізу і праўда чуўся дзіўны грукат. У кватэры адбывалася штосьці незразумелае.

«У вас моцныя дзьверы? – спытаў Анцік. – Скажы, што яны жалезныя!»

«Жалезныя, – сказаў я. – Сталёвыя! Тата з мамай аддалі за іх пяцьсот баксаў».

«А мой тата кажа, што гэта глупства, ставіць жалезныя дзьверы, калі ў цябе няма чаго красьці».

«Як жа, няма, – сказала Юля. – А мы? Што гэта за гук?»

«Глядзіце!» – ускрыкнуў Анцік і паказаў на акно.

З таго боку шыбы раптам зьявілася лесьвіца. Дзьве палкі, якія, трасучыся, шукалі апору. Так, гэта была драўляная лесьвіца, якая ўперлася канцом проста ў гзымс, і хоць выглядала яна тут проста неверагодна, факт заставаўся фактам. Нехта прыставіў лесьвіцу да сьцяны нашага дома і рыхтаваўся забрацца да нас у акно!

Мы ўскочылі і кінуліся ў спальню маіх бацькоў. А там, не згаворваючыся, залезьлі ў першую ж шафу і зачынілі за сабой дзьверы. І як толькі мы гэта зрабілі, усім стала ясна, што гэта не найлепшае рашэньне. Але што рабіць, ніхто з нас ня ведаў. Пакуль мы размаўлялі з голасам, ноўтбук на стале нарэшце згас – і цяпер у спальні была непраглядная цемра.

«Вось бы Божанька, калі ён існуе, уключыў зараз сьвятло ў доме. Хаця б для таго, каб паглядзець, як мы маемся, – падумаў я. – Хаця б для таго, каб нас пакараць. Проста ўключы электрычнасьць – і ўсё скончыцца. Ты ж Бог, табе ж не патрэбная падзарадка!»

«Лявон, ты што там, молішся?» – прашаптала Юля, пры-

ціснутая да мяне маміным футрам.

«Не, ты што», – сказаў я, а сам пачырванеў так, што, здавалася, гэта было відаць нават у змроку.

«А гучыць так, быццам молішся», – прашаптала Юля, узіраючыся ў шчылінку між дзьверак. Але што яна магла там пабачыць…

У шафе пахла вельмі прыемна. Тут вісела ня толькі маміна футра, тут былі яшчэ і паліто, і татавы пінжакі, і нават ягоны вясельны касьцюм – я пазнаў яго па шурпатай тканіне. Тут віселі маміны зімовыя сукенкі, якія яна ўжо зусім хутка зьбіралася даставаць, бо восень рабілася ўсё халаднейшая. Уся гэтая вопратка нагадала мне пра тое, што ў мяне ёсьць бацькі – я чамусьці верыў, што ўжо адной сваёй прысутнасьцю тут яны б разагналі ўсю цемень і ўсіх злых духаў, што невядома зь якой прычыны накінуліся на нашу кватэру. Але рэчы былі маўклівыя і ўсім сваім выглядам паказвалі, што нічым ня могуць нам дапамагчы. Яны нібы спалі – і цяпер незадаволена шаргаталі пра тое, што ў шафе і так мала месца, што мы прымушаем іх пацясьніцца і нічога добрага з гэтага не атрымаецца.

«Ой, – сказаў Анцік. – Я ня ведаю, што гэта, але яно вісіць у мяне перад носам і так смачна пахне».

«Усе сукенкі смачна пахнуць», – сказала Юля.

«Яно пахне чакалядай», – сказаў Анцік.

«Бедны хлопчык, – прашаптала Юля. – Ты ўжо звар’яцеў ад страху».

«Можа й так, – сказаў Анцік. – Але тут ёсьць ад чаго звар'яцець. Цэлы пакет цукерак».

«Ты трызьніш», – сказаў я.

«Я жую, – сказаў Анцік. – Хоць чакалядаы наемся перад сьмерцю».

Сьмерцю? Дагэтуль я яшчэ ніколі ня думаў пра сьмерць. Яна была проста словам, якое мы чулі ледзьве ня кожны дзень, і гэтае слова вымаўлялі ўсе, хто нас акружаў: героі фільмаў і кніг, дзядзечкі і цётачкі ў тэлевізары і ў інтэрнэце, пэрсанажы кампутарных гульняў і настаўнікі гісторыі і беларускай літаратуры, мама і тата, і бабуля, і Юліны бацькі, якія верылі ў Бога. Абдымаючы маміна футра, я думаў пра тое, што, напэўна, калі-небудзь зразумею, што такое сьмерць. І пра тое, што Анцік, вось гэты мой малы сябрук Анцік, толькі што выпадкова адшукаў мамін стратэгічны запас чакалады з сакрэтнай шафы.

«Давайце праверым, што там робіцца, – прапанаваў я. – Толькі ціха…»

Мы зь Юляй асьцярожна прачынілі дзьверы шафы – і ў вочы нам ударыў дым.

«Сьвечка! – крыкнуў я. – Дзе твая сьвечка, Юля?»

«Ня ведаю, – Юля зноў зачыніла шафу і прыціснула да сябе дзьверы. – Я ня ведаю. Я яе згубіла, калі мы ўцякалі…»

«Там пажар! – сказаў я. – І мы задыхнемся, разумееш?»

Усе трое мы вываліліся з шафы на падлогу, як падушкі. І пачулі, як за сьцяной нехта ходзіць. Я рвануў на сябе дзьверы

пакоя і замкнуў іх на ключ.

«Юля! Анцік! Уцякаем!»

«Куды?»

Гэта быў адзіны пакой у нашай кватэры, які замыкаўся. Я некалькі разоў пытаўся ў мамы з татам, чаму менавіта іх спальня мусіць мець замок з ключом, але так і не дабіўся ўцямнага адказу. Але цяпер замок мог даць нам час, каб нешта прыдумаць.

У пакоі так моцна засьмярдзела дымам, што ў мяне з вачэй паліліся сьлёзы.

«У акно! – крыкнула Юля, заплаканая, быццам толькі што ўшчэнт прайгралася ў уна. – Гэта адзіны шлях!»

Я ўзьляцеў на стол, як птушка, без разьбегу. Бачыў бы мяне наш настаўнік фізкультуры! Я разнасьцежыў акно і з асалодай удыхнуў халоднае паветра. Зірнуў уніз і адчуў здрадніцкае трымценьне недзе ў жываце і ў пятках.

Высока, занадта высока! А Юля ўжо зьбірала з ложка падушкі, сьцягвала з раскладушкі ўсё, што там ляжала.

«Што стаіце? Цягніце? Футра з шафы, матрас, усё!»

Мы з Анцікам стаялі, як здранцьвелыя, і глядзелі на тое, як спрытна яна рухаецца. Нібы ў яе было дзесяць рук і восем ног. Што ні кажы, а ў жанчын нейкі прыродны талент упраўляцца з такімі рэчамі.

«Кідайце ўсё ў акно! – скамандавала Юля. – Ну!»

Мы сталі дапамагаць ёй, натыкаючыся ў цемры адзін на аднаго.

«А зараз скачам проста ўніз! – сказала Юля. – Я першая, вы за мной!»

І яна глыбока ўдыхнула і скочыла проста ў дождж.

«Я баюся!» – закрычаў Анцік, не выпускаючы з рук пакет з цукеркамі.

«І я», – прашаптаў я, схапіў яго за плечы і падштурхнуў да краю падваконьня. Гэтаксама некалі ў школе штурхалі мяне, калі мы скакалі з вышкі ў басэйне.

«Давай, Анцік!»

Ён азірнуўся, пасьлізнуўся на мокрым падваконьні і ўпаў у цемнату.

«Усё ў парадку, я яго злавіла ў футра», – пачуў я Юлін голас.

Я азірнуўся на спальню маіх бацькоў. Дым насоўваўся на мяне, але я ўжо не задыхаўся. Вогкае восеньскае паветра напаўняла мае лёгкія, нібы ветразі. А дзьверы спальні ўжо дрыжалі ад удараў – я бачыў, як скаланаецца ключ у замку. Я павярнуўся тварам да вуліцы. Ліхтар сьвяціў гэтаксама, як раней, быццам за апошнія паўгадзіны нічога не адбылося – цьмяна, загадкава і па-свойму прыцягальна. Нібы клікаў мяне, нібы падміргваў. Нібы дражніўся: *ты ня зможаш, ты ня зможаш. Хіба табе не цікава, хто палюе на цябе ў тваёй уласнай кватэры? Хіба ты ня хочаш паглядзець ім у вочы? Хіба ня хочаш даведацца, як выглядаюць ПАЧВАРЫ?*

Юля і Анцік бегалі ўнізе і махалі рукамі.

Я заплюшчыў вочы.

І скочыў.

Мне здавалася, я буду ляцець уніз вечна.

Але не прайшло і сэкунды, як я бухнуўся на цэлую гару падушак і коўдраў. Праўда, у калене нешта шчоўкнула, але я адразу ж ускочыў на ногі.

«Бяжым!» – крыкнула Юля і кінулася праз пустую вуліцу. Мы за ёй.

«Асьцярожна, там аўтобус!» – залямантаваў я.

Ён і праўда паволі выехаў з-за павароту, утульна асьветлены знутры, нібы плывучы дом, што блукае ў тумане, шукаючы гаспадароў. Але гэта быў ня дом, гэта быў звычайны гарадзкі аўтобус – і мне на імгненьне здалося, што Юля трапіць проста яму пад колы. Аднак яна скочыла на прыпынак перад самай аўтобуснай пысай і пляснулася абедзьвюма нагамі ў лужыну.

Аўтобус спыніўся і адчыніў дзьверы.

«Едзем!» – крыкнуў я, заскокваючы ўсярэдзіну. Юля і Анцік заскочылі ўсьлед за мной. Дзьверы зачыніліся, і аўтобус паплыў наперад па нашай вуліцы, разганяючы фарамі туман і цемру.

«Я ведаю, як ён едзе, – сказаў я, задыхаючыся. – Мы выйдзем праз пару прыпынкаў і перасядзем на трамвай, які едзе да маёй бабулі. Бабуля прыдумае, што рабіць!»

«Але мы зь Юляй маглі б зараз проста пабегчы дамоў! – сказаў Анцік. – І ўсё б скончылася. І ў мяне зуб баліць».

«Ты, Анцік, можаш выйсьці на наступным прыпынку, –

сказала Юля. – І пайсьці да мамачкі. Але я застануся зь Лявонам. Сяброў не кідаюць у пустым аўтобусе, бяз курткі і ў тапачках. Невядома, ці ходзяць яшчэ трамваі. Ужо позна! А грошай на таксі ў нас няма».

«Ды я проста так сказаў, – зьбянтэжыўся Анцік. – Вядома, я з вамі».

Аўтобус між тым разганяўся ўсё хутчэй.

# Разьдзел трэці

У гэтым аўтобусе мы былі адзіныя пасажыры, таму маглі сесьці, дзе нам захочацца. Пасьля ўсяго, што мы перажылі падчас уцёкаў, мне любое сядзеньне падавалася зручным. Цемра, таямніцы, званок, голас на пляцоўцы, шафа, дым, пажар… Я вельмі спадзяваўся, што ў кватэры спрацуе апавяшчальнік і пажарнікі прыедуць хутчэй, чым наш дом ператворыцца ў кучу попелу.

Ці мог я ўявіць, калі мама цалавала мяне ў лоб на парозе нашай кватэры, што гэты восеньскі вечар будзе поўны такіх прыгодаў?

Аўтобус выехаў на шырокую вуліцу, тут наш раён канчаўся. Я адчуў стому, таму ўладкаваўся каля акна, выцягнуў ногі і прыплюшчыў вочы. Юля села сьпераду каля мяне, а вось Анцік усё бегаў па салёне, як ненармальны, і ніяк ня мог супакоіцца. Ён прысаджваўся то тут, то там, і зноў ускокваў, нібы ўпершыню ехаў у грамадзкім транспарце.

Назіраючы за ім, я падумаў, які ж ён яшчэ малы. На цэлы год за мяне малодшы! Я ўжо і ня памятаў, як мы зь ім пасябравалі. Цікава ўсё-ткі, разважаў я, адкуль у нас бяруцца сябры. І каго можна лічыць сапраўдным сябрам, а каго не. Напэўна, толькі ўначы ў пустой кватэры без электрычнасьці і без дарослых чалавеку робіцца ясна, з кім ён сябруе напраўду, а з кім проста выпадкова апынуўся побач.

«Спаць хочацца, – сказала Юля. – Але нельга. Ты сочыш, калі нам выходзіць?»

«Так, – сказаў я. – Яшчэ пару прыпынкаў. А мне вось хочацца ня спаць, а есьці. Анцік, дзе твой пакет з цукеркамі?»

«Якімі цукеркамі?» – спытаў Анцік, прабягаючы міма.

«Маімі цукеркамі, – сказаў я. – Тымі, якія ты знайшоў у мамінай сакрэтнай шафе».

«А, гэтымі, – сказаў Анцік. – Я думаў, гэта цукеркі тваёй мамы».

Мне зрабілася няёмка. Бо Анцік захапіў з сабой пакет, які ня толькі яму, а нават і мне насамрэч не належаў. Я ніколі б ня стаў залазіць у бацькоўскую шафу, каб скрасьці адтуль цукеркі. Дый проста так ня стаў бы залазіць. А што ў выніку? Мы іх усё-ткі скралі!

«Ну і што, што маміны? – сказала Юля Анціку. – Ты ж разумееш, што ўзяў чужое?»

«Гэта быў гэты… як яго… форс-мажор! – сказаў Анцік. – Калі б Лявонава мама ведала, што адбылося, яна сама б аддала іх нам. На месцы тваіх бацькоў я б засыпаў нас усімі цукеркамі сьвету, толькі б мы засталіся жывыя!»

Мне зрабілася непрыемна. Так бывала кожны раз, калі іншыя людзі пачыналі абмяркоўваць маіх бацькоў. Мне падабалася быць разам з Анцікам і Юляй, я быў ім удзячны, што яны са мной – але сябры гэта сябры, а бацькі – гэта нешта такое тваё… Самае тваё на сьвеце. Такое, пра што ня вельмі хочацца размаўляць зь іншымі. Бацькі – яны як твая таям-

ніца. А Анцік і Юля гаварылі пра іх так, быццам самі былі іхнымі дзецьмі.

«Ды вось, трымай свае цукеркі, на здароўе, – сказаў Анцік, кінуўшы позірк на мой засмучаны твар. – Я вам зь Юляй пакінуў парачку».

«Парачку? – я раскрыў пакет і засунуў туды руку. – Іх і праўда ўсяго дзьве. І ніводнай чакаляднай!»

«Можа, толькі дзякуючы такой дозе кафэіну я дагэтуль трымаюся на нагах…» – задуменна сказаў Анцік.

«Якога яшчэ кафэіну?»

«Нават малыя дзеці ведаюць, што ў чакалядзе ёсьць кафэін, – горда сказаў Анцік. – Гэта такое рэчыва, ад яго чалавек робіцца бадзёры і можа скакаць з другога паверху. І не баіцца супэрхуткасьці. Слухайце, а нам пашанцавала з кіроўцам! Заўважылі, як ён гоніць?! Як ракета!»

Сапраўды, аўтобус гнаў наперад штомоцы. Было адчуваньне, што ён ня едзе, а ляціць нізка над зямлёю, як вялікая птушка. Мне нават падалося, што ён пару разоў праехаў на чырвонае сьвятло, але ў цемнаце навокал сьвяціла стольki розных агнёў, я мог і памыліцца. Мы зь Юляй зірнулі ў бок кабіны кіроўцы, нам было відаць ягоную патыліцу, руку, якая ўпэўнена ляжала на стырне, і цень ягонага твару ў люстэрку наверсе. Здаецца, усё было ў парадку, але…

«Не разумею, – сказаў я. – Здаецца, мы праехалі наш прыпынак».

Праехалі – гэта было слаба сказана. Мы праляцелі яго, ні-

бы страла, і цяпер несьліся па праспэкце наперад так, быццам за намі гналася міліцыя.

«Ён што, звар’яцеў? – сказаў я з трывогай. – Мы так урэжамся зараз у кагосьці, ці пешахода саб’ем».

Рэдкія мінакі пад парасонамі, якія мірна пераходзілі вуліцу, у жаху кідаліся ў бакі, калі перад імі раптам вырастаў наш аўтобус. Узьнімаючы з абодвух бакоў вялізныя хвалі вады і заліваючы ходнік і легкавікі, што апыналіся зь ім па суседзтве, ён рухаўся па горадзе, як ракета.

«Чорт!» – крыкнуў Анцік.

«Не кажы так, Божанька ўсё чуе!» – пакруціла галавой Юля.

«Мы зараз узьляцім!» – махнуў рукой Анцік, бо матор роў усё больш аглушальна. І я быў зь ім згодны: аўтобус так падкідвала, што мы і праўда маглі ў любы момант паляцець да аблокаў.

Недзе ў нас пад нагамі пачуўся раптам рэзкі скрыгат. Юля ўчапілася ў поручань, я таксама схапіўся за яго і ўціснуўся ў сядзеньне, а Анцік паваліўся нам пад ногі, бо аўтобус на поўным ходу зрабіў паварот, рыкнуў і рвануўся на ўсёй хуткасьці на зусім іншую вуліцу. Я ўжо даўно не разумеў, дзе мы, аўтобус ехаў па зусім незнаёмым маршруце і не зьбіраўся спыняцца.

«Ну, цяпер нам дакладна трэба выходзіць, – сказаў я, у роспачы гледзячы ў бок кабіны. – Давайце станем усе разам каля дзьвярэй, можа, ён думае, што мы едзем да канцавой».

Але кіроўца і не падумаў спыняцца, ні на наступным прыпынку, ні на іншым. З ровам і скрыгатам на поўнай хуткасьці ён прамінуў апошнюю станцыю мэтро – я толькі і пасьпеў што прачытаць яе назву. А потым, зларадна мірганувўшы фарамі, пагнаў некуды ў цемень, туды, дзе не было ліхтароў. І вось за вокнамі ўжо віднеліся толькі палі і цёмныя абрысы катэджаў. Горад застаўся за нашымі сьпінамі, і мы зусім ня ведалі, што нам рабіць.

«Што адбываецца? – крыкнуў я. – Кіроўца! Ён там што, заснуў?»

«Думаю, што ўсё значна горш!» – крыкнула ў адказ Юля. Чапляючыся за поручні, яна кінулася да кабіны кіроўцы. Я пайшоў за ёй, разумеючы, што нашы прыгоды яшчэ зусім ня скончыліся.

У кабіне было цёмна. Трапіць мы ў яе ніяк не маглі, бо ў аўтобусах, што езьдзяць у нашым горадзе, кіроўца сядзіць за празрыстай перагародкай. Але ў перагародцы было акенца, у якое пасажыры перадаюць манэткі, каб купіць білеты. Ды што я вам расказваю, што вы, у аўтобусах ня езьдзілі? Хоць наўрад ці вам некалі даводзілася езьдзіць у такіх аўтобусах, якія гоняць, нібы з ланцуга сарваўшыся, зусім не туды, куды мусяць.

Праз перагародку мы зь Юляй бачылі, як кіроўца ўзіраецца ў цемру перад сабой. Цемру, якую разразалі надвое жоўтыя палосы сьвятла аўтобусных фараў. Кіроўца не зьвяртаў на нас ніякай увагі. Здавалася, ён наогул не варушыўся.

«Гэй! – закрычалі мы і загрукалі ў пластыкавую перагародку. – Спыніцеся! Прачніцеся! Гэй!»

Кіроўца нават не павярнуў галаву ў наш бок. Нібы ён выконваў нейкае заданьне і не зьбіраўся парушаць загад. Ён выглядаў так вусьцішна ў сваёй нерухомай паставе, што мне падалося, за стырном нашага аўтобуса сядзіць мярцьвяк.

Што, калі гэта быў зусім не аўтобус? А «лятучы галяндзец», пра які я чытаў? Сучасны карабель мёртвых?

І тады Юля прасунула руку ў акенца і ўхапілася за рукаў кіроўцы.

Вось жа адважная! Я б лепш засунуў руку ў пашчу тыгра, чым у гэтае акенца, ды яшчэ ў такі момант!

«Гэй! – крыкнула Юля, торгаючы кіроўцу за рукаў. – Ты што, звар’яцеў? Выпусьці нас адсюль!»

Яна пацягнула рукаў на сябе – і здарылася нешта жудаснае! Кіроўца паваліўся ў наш бок, так лёгка, як быццам ён быў проста лялькай, апранутай ва ўніформу!

Юля зараз жа схавала руку і завішчала.

«У яго *мяккая рука! Мяккая рука!*»

Здранцьвелыя, мы глядзелі, як кіроўца валіцца са свайго сядзеньня ўніз, на падлогу кабіны.

Цяпер за стырном не было нікога.

Аўтобус ляцеў наперад – і ім ніхто не кіраваў!

І тады я таксама закрычаў. А за мной і Анцік, які стаяў за нашымі сьпінамі.

«Гэта ўсё ты, Лявон! Ты пасадзіў нас у гэты чортаў аўто-

бус!» – румзаючы, лямантаваў Анцік.

І тады Юля замоўкла.

«Што ты сказаў?» – спытала яна.

«А што, няпраўда? Хто нам сказаў садзіцца ў аўтобус? Лявон! – заявіў Анцік, выціраючы сьлёзы. – Мы паедзем да маёй бабу-улі, яна прыду-умае…»

Перадражніваючы мяне, ён крыўляўся, а сьлёзы не перасталі цячы зь ягоных зусім дзіцячых вачэй.

«Што, ня так?»

«Ты зноў успомніў чорта! – строга сказала Юля. – Так нельга. Чорт і так ужо даўно з намі! Вось ён, відаць, радуецца, калі мы яго клічам!»

«Тады пакліч свайго божаньку! – крыкнуў ёй Анцік. – Хай ён нам дапаможа! Што маўчыш?»

«Трэба нешта рабіць, а не крычаць і румзаць», – сказала Юля.

«Давайце станем каля вокнаў і будзем махаць рукамі, – прапанаваў я. – Можа, нас заўважаць і зразумеюць, што мы трапілі ў бяду! І прыдумаюць, як спыніць гэты вар'яцкі аўтобус!»

Мы кінуліся да вокнаў і пачалі грукаць у іх і крычаць, хто як мог. Бо аўтобус якраз пралятаў па вуліцы нейкай ці то вёскі, ці то маленькага гарадка. Абапал вуліцы стаялі невялікія дамы, абнесеныя платамі, дзе-нідзе ў дамах гарэла сьвятло, а на ўзбочынах нават стаялі ліхтары, асьвятляючы самотных людзей, што сьпяшаліся дахаты ў насунутых на галовы ка-

пюшонах.

На сэкунду мне падалося, што ў акне аднаго з дамоў была відаць вялікая кампанія дарослых, якія сядзелі каля каміна з келіхамі ў руках, і ў адной жанчыны на каленях ляжаў сабака. А яшчэ мне падалося, усяго толькі на нейкае імгненьне, што сярод тых дарослых у ярка асьветленым акне я разгледзеў сваіх маму і тату. І ў мамы на плячах быў пухнаты плед, а ў таты на каленях талерка, поўная гарачых закусак.

Але той дом зь ярка асьветленым акном мільгануў і зьнік. Аўтобус праляцеў праз гарадок, нібы мэтэор, і зноў выскачыў на цёмную шашу. Мы бачылі толькі дарожныя знакі, што сьвяціліся ў змроку, цёмны край блізкага лесу і бясконцыя чорныя прасьцірадлы начных палёў.

«Так, – сказала Юля. – Я палезу ў кабіну і пастараюся зрабіць так, каб мы затармазілі! А вы трымайце мяне за ногі!»

«Ты што! Ты туды галаву не прасунеш!» – сказаў я.

Юля адмахнулася. Вось жа ўпартая. Яна стала на сядзеньне і пастаралася прасунуць галаву ў акенца кабіны. Спачатку ў яе нічога не выходзіла, але Юля напружылася – і, падраўшы сабе вуха, усё ж апынулася ў кабіне. Праўда, толькі галавой.

«Цяпер руку!» – пачулі мы яе голас.

«Трэба было спачатку руку, а потым галаву, дурніца!» – пакруціў пальцам каля скроні Анцік.

«Які ты разумны! – накінуўся я на яго. – Можа, лепш цябе туды засунем? Ты дакладна пралезеш!»

«Шкада, што нельга адшпіліць сабе руку, – пачулі мы пры-

душаны Юлін голас. – Калі-небудзь вучоныя прыдумаюць, як можна разьбіраць сябе на часткі! Так, каб потым зноў сабраць!»

«Трэба проста разьбіць перагародку! – сказаў я. – Памятаеце, у кожным аўтобусе ёсьць надпіс: дастаць малаток, выціснуць шкло?»

«Тады цягніце мяне назад!» – сказала Юля.

Мы схапілі яе за ногі і пацягнулі.

«Хто так цягне? – зараўла Юля. – Хлопчыкі! Дзе ваша пяшчота!»

Але было ўжо занадта позна.

Бо ў гэты самы момант аўтобус завіхляў на горцы, выскачыў на мост, пад якім цямнела рака, і ўрэзаўся з усёй моцы ў агароджу.

Толькі што перад намі была прамая дарога ў промнях фараў, а цяпер іх сьвятло выхапіла зь цемры толькі кавалак неба, якое імкліва сыходзіла некуды ўверх.

Аўтобус зьнёс агароджу на поўным хаду, лёгка, нібы адной пстрычкай.

І паляцеў над прорвай, проста ў раку.

Калісьці я чытаў пра мужчыну, які быў чэмпіёнам у плаваньні і аднойчы ўратаваў цэлы тралейбус людзей, што выпадкова ўпаў з моста. Гэты мужчына пабачыў, што тралейбус тоне, кінуўся ў ваду і даставаў людзей аднаго за адным, пакуль не ўратаваў усіх. Была зіма, гэты чэмпіён захварэў на запаленьне лёгкіх і нырак, і потым памёр. Я часта бачыў у

сьне тую страшную карціну, я сам уяўляў сябе ў тым тралейбусе, які ідзе на дно і я ніяк не магу зь яго выбрацца. Якім жа шчасьцем было прачынацца ў цёплым ложку, у сваім пакоі! Потым жахлівы сон перастаў мне сьніцца. А цяпер, у аўтобусе, які нібы завіс на сэкунду над безданьню, каб назаўсёды пайсьці пад ваду разам з намі, я зноў успомніў тую гісторыю – і карцінка тралейбуса, які тоне ў рацэ, зноў зьявілася перад вачыма.

Толькі вось наўрад ці ў такі час, далёка ад гораду, на беразе ракі знойдзецца чэмпіён у плаваньні, які нас уратуе.

На імгненьне зрабілася ціха…

А тады вакол нас пачуўся такі шум, ад якога закладвала вушы!

Гэта аўтобус, у які мы трапілі, нібы ў пастку, з усяго размаху пляснуўся ў раку!

Мы закрычалі ўсе трое, адначасова, ды так, быццам хацелі сваім крыкам выбіць шыбы ў вокнах, за якімі цяпер была цёмная, халодная вада.

Аўтобус паволі паплыў – і мы пачулі, як вада пачынае пранікаць у салён.

Мы схапіліся за рукі, усе трое.

«Я хачу дамоў! – крыкнуў Анцік. – Лявон, скажы, што мы сьпім!»

«Мы ня сьпім», – сказаў я вінавата. Бо гэта і праўда я, менавіта я і ніхто апрача мяне, быў тым чалавекам, які сказаў усім садзіцца ў гэты жудасны аўтобус.

«Спакойна, – сказала Юля. – Мы ўсе ўмеем плаваць, праўда?»

«Я ўмею», – сказаў я.

«І я», – сказала Юля.

«А я не!» – заплакаў Анцік.

«Ты ж хадзіў у гурток плаваньня! – зьдзівіўся я. – Ты ж выхваляўся нам, што ўмееш і брасам, і кролем!»

«Я кінуў, – усхліпнуў Анцік. – Раз схадзіў і кінуў».

«Дык ты хлусіў? – жахнулася Юля. – А мы табе зайздросьцілі!»

«Мы былі дурні», – сказаў я.

«Усё роўна, – сказала Юля. – Мы можам забрацца на дах аўтобуса, саскочыць у ваду і даплыць да берага. А Анціка пацягнуць за сабой. Ну, ці даць яму штосьці, што дапаможа трымацца на вадзе».

«Толькі хутчэй, – прамармытаў Анцік. – Бачыце, вады ўжо амаль па калена!»

«А як жа кіроўца?» – сказаў я.

«Ты яшчэ не зразумеў? – зьдзівілася Юля. – Гэта была лялька!»

Я ўскочыў на сядзеньне і пацягнуўся да люка над галавой, каб адчыніць яго і вылезьці на дах. Але ніяк ня мог дацягнуцца. Я быў самы высокі ў нашай кумпаніі, і ўсё ж мне не хапала росту. «Давай ты сядзеш мне на шыю!» – крыкнуў я Юлі і нахіліўся, каб яна магла на мяне залезьці.

«Хутчэй! – падганяў нас Анцік. – Вада ліецца з усіх

дзірак!»

Я і сам адчуваў, што мы тонем.

І тут здарылася нешта неверагоднае.

Нібы нехта падставіў пад бруха нашага аўтобуса сваю шырокую, роўную сыпіну. Падставіў і прыўзьняў – так, што вады вакол нас адразу паменела.

«Можа, мы селі на мель? – з надзеяй спытаў я. – Можа, гэта зусім неглыбокая рэчка?»

«Але мы плывем, – сказала Юля. – Адчуваеце? Вада нясе нас наперад. Калі б мы селі на мель, мы б ня рухаліся!»

«Ура! – крыкнуў Анцік. – Ня ведаю, хто там пад намі, але я зь ім сябрую!»

Мы прыпалі да вокнаў. За імі быў толькі туман, туман, ноч і вада, у якую няспынна сыпаліся дажджавыя кроплі. Мы плылі па рацэ, нібы на караблі – і цяпер у гэтым было нават штосьці прыгожае.

«Цікава, куды вядзе гэтая рака? – спытаў Анцік. – Лявон, у цябе ж дзесяць па геаграфіі. Ты ж усе беларускія рэчкі на памяць знаеш!»

«Ну, ня ўсе… – сказаў я. – У Беларусі ведаеш колькі рэкаў?»

«Колькі?»

«Дваццаць тысяч! – адказаў я з гонарам. – І дзесяць тысяч азёраў!»

«Адкуль ты ведаеш?» – з павагай паглядзела на мяне Юля.

«Ведаю», – ухіліўся я ад адказу. Хоць тлумачылася ўсё

проста. Нядаўна мне давялося рыхтаваць спавешчаньне ў школе, і я грунтоўна праштудыраваў артыкул у Вікіпэдыі.

«Дваццаць тысяч, – уздыхнуў уражаны Анцік. – Ня можа быць!»

«Можа», – сказаў я.

«Як жа нас знойдуць? А калі гэтая рэчка ўпадае ў іншую рэчку, а тая ў іншую, а тая ў Чорнае мора? Значыць, нас могуць знайсьці ў Міжземным?» – задумалася Юля.

«Не, нам трэба выбрацца адсюль і вярнуцца ў Менск», – цьвёрда сказаў я.

Вакол нас ціха плёскалася вада.

«Значыць, мы не патонем?» – спытаў Анцік.

«Пакуль што не… – сказаў я, з трывогай узіраючыся ў акно. – Нешта нясе нас наперад. Нібы на сьпіне. Можа, плынь ракі, а можа…»

«Што можа?»

«Столькі ўсяго адбылося, што ўжо і ня ведаеш, ці ёсьць ва ўсяго гэтага тлумачэньне…» – сказаў я і пазяхнуў.

«Спаць хочацца», – замахаў рукой у сябе перад носам Анцік, нібы адганяў нейкіх сонных мух.

«Нельга», – прамармытаў я. – «Скажы, Юля?»

Але Юля ўжо й сама задрамала пад ціхі плёскат вады і шум дажджу. Я хацеў яе пабудзіць, але паваліўся носам на яе плячо і таксама заплюшчыў вочы.

# Разьдзел чацьверты

Я прачнуўся ад холаду і, не расплюшчваючы вачэй, пачаў намацваць рукамі коўдру. Мне абавязкова трэба было дасьніць свой сон, бо ў гэтым сьне я кіраваў машынай – сапраўднай машынай, чорным легкавіком, які імчаў па вуліцы і слухаўся кожнага майго руху. Як жа гэта было файна! Я толькі што прыехаў на вуліцу, дзе ўсе мяне ведалі, і я ўжо адчуваў, як яны зараз пабачаць мяне за стырном прыўкраснага аўто, а я прытармажу і апушчу акно, і тады…

Што тады?

Замест цёплай коўдры я намацаў нешта мокрае і халоднае. Побач пачулася ціхае ўсхліпваньне. Я ўжо нічога не разумеў. Хто гэта мог румзаць у маім пакоі? У нас дома такое было не прынята. Я прыбраў руку і нарэшце адплюшчыў вочы.

Перада мной сядзеў Анцік і глядзеў проста мне ў твар, а зь ягоных вачэй ліліся сьлёзы. І сядзелі мы зусім не ў маім пакоі, а ў пустым, сырым і халодным аўтобусе, і ў Анціка з рота ішла пара, а за вокнамі быў толькі непраглядны белы туман.

«Ты што?» – ускочыў я і раззлавана замахаў на Анціка здранцьвелымі рукамі, бо на імгненьне мне падалося, што гэта ўсё ягоныя жарцікі.

«Я хачу дахаты!» – крыкнуў Анцік сваім знакамітым басам і зноў зарумзаў.

І тады я адразу ўспомніў, у што мы ўляпаліся. Успомніў, выцер рукі аб прамерзлае сядзеньне і адвярнуўся, бо зусім ня ведаў, што нам цяпер рабіць.

Вы калі-небудзь прачыналіся ў аўтобусе? Зусім адны ў халодным аўтобусе, у якім ратаваліся ўначы ад нейкай містычнай сілы, аўтобусе, які ледзь не патануў у рацэ і кіроўца якога аказаўся лялькай? У аўтобусе, што захрас невядома дзе ў лесе, сярод туману? Калі так, дык вы можаце ўявіць сабе, што я адчуваў у той момант. Але чамусьці мне здаецца, што вам ніколі не даводзілася прачынацца ў гэткіх вясёлых абставінах. Ну, цалкам магчыма, усё яшчэ наперадзе, скажу я вам. Ніколі не загадвайце на будучыню, што з вамі можа здарыцца. А што да Анціка, дык я, вядома ж, паспрабаваў яго супакоіць:

«Я таксама хачу дахаты, Анцік! Як і ты. Мы выберамся. Пабачыш. Чэснае слова!»

«Я хачу есьці!»

«Я таксама, – сказаў я. – Давай пашукаем штосьці».

«Я хачу ў туалет!»

«Рабі пад сядзеньне, – сьмела прапанаваў я. – Я адвярнуся. Толькі не пад маё, калі ласка!»

«Я хачу дамоў!»

«Мы блізка ад гораду, – сказаў я так упэўнена, як толькі мог. – Мы ж не ў пустыні Калахары. Да вечара вернемся! Знойдзем людзей і… А дзе Юля?»

«Я ня ведаю! – зноў зарумзаў Анцік. – Можа, яе ў сьне

скралі?»

«Хто? – я ўжо быў не на жарт устрывожаны. – Дзьверы ж зачыненыя!»

«Хто? – Анцік паглядзеў на мяне і раптам сьцішыў голас. – Той, хто прывёз нас сюды…»

Я паглядзеў у бок кабіны кіроўцы. Там не было нікога – але набліжацца да кабіны мне зусім не хацелася. Трэба было знайсьці Юлю. Я асьцярожна прайшоўся ўздоўж сядзеньняў, у самы канец, потым вярнуўся, паглядзеў сьпераду, набраўся адвагі і ўсё ж зазірнуў у кабіну… Юлі нідзе не было.

«Глядзі! Люк! – сказаў Анцік, паказваючы пальцам угару. – Ён адчынены!»

І праўда. Проста над намі быў люк, праз які мы бачылі адно белую сьцяну туману. Гэты туман пачаў ужо запаўзаць у аўтобус – бялявае воблачка вісела над поручнямі, і я, ускочыўшы на сядзеньне, адагнаў яго рукой. Але воблачка не расьсеялася, яно быццам учапілася за маю руку і цяпер павісла на ёй, і мне давялося зрабіць некалькі рэзкіх узмахаў, каб яно адплыло на сваё месца. Відаць, Юля здолела залезьці сюды сама, па поручнях, і выбрацца вонкі, на дах. А калі змагла Юля, трэба было пастарацца і нам.

Я паставіў Анціка на сядзеньне, залез яму на плечы і, трымаючыся за поручань, падцягнуўся да адчыненага люка і высунуў галаву.

Мая галава апынулася ў такім густым тумане, што я папросту асьлеп. Нібы я засунуў галаву ў птушынае малако.

Анцік нешта крычаў мне зьнізу, але я ня чуў. Туман ахутаў маю галаву, быццам шапка. Але мінула мо якая хвіліна, і я звыкся – і мне нават падалося, што ў гэтым ёсьць нешта прыемнае. Туман надаў мне бадзёрасьці, і я паднатужыўся і вылез на дах. Я быў на свабодзе – і гэта адразу ўзьняла настрой. Выцягнуць з аўтобуса Анціка аказалася не такой лёгкай справай. Але вось мы ўжо абодва стаялі на даху і ўдыхалі пах ранішняга лесу. Лес быў зусім блізка, лес цямнеў між туману – дрэвы, як нейкія волаты ў чорнай форме, абступілі наш аўтобус і чакалі, што мы будзем рабіць далей.

Мы пераглянуліся і асьцярожна палезьлі ўніз. Саскочылі на зямлю і толькі тады выдыхнулі.

«Юля! – крыкнуў я. – Юля!»

«Юля-а-а!» – залямантаваў Анцік такім голасам, нібы яму рвалі зубы без замарозкі.

«Добрай раніцы, – пачулі мы зусім блізка яе насьмешлівы голас. – Ня трэба так крычаць. Вы яе напужалі».

Мы з Анцікам кінуліся на яе голас, проста ў гушчу туману – і не паверылі сваім вачам. Варта нам было зрабіць крокаў дзесяць – як мы выйшлі з нашага туманнага палону на бераг ракі, а там…

Над ракой туману не было. Толькі шызая празрыстая смуга і шэрае неба. Смуга, неба і цішыня. Непралазны туман клубіўся абапал ракі, як дзьве белыя сьцяны, але на берагах, што на гэтым, што на тым, было чыста. Юля сядзела на кукішках каля самай вады і глядзела на яе так уважліва, быц-

цам рыбу ў ёй лавіла. Мне нават падалося, што мы неяк не ў пару тут зьявіліся. Перашкодзілі мы ёй, ці што?

«Не хацела вас будзіць, – сказала Юля. – Але калі вы ўжо ўсталі, не крычыце, ня румзайце і паводзьцеся прыстойна».

«Гэта яшчэ чаму? – засоп Анцік. – Калі я крычу ці румзаю, мне, напрыклад, робіцца лягчэй».

«Напрыклад… – перадражніла яго Юля. – Слухайце, вы можаце трошкі памаўчаць?»

«Хопіць крыўляцца, Юля, – сказаў я. – І гаварыць загадкамі. Каго мы можам тут напужаць?»

«Яе, – сказала Юля і паказала пальцам на ваду. – Рэчку».

Мы з Анцікам падышлі да вады і ўтаропіліся на яе, як два дурні. Вада была цёмная, брудная, дна не відаць, каля берага ляжала, падрыгваючы зеленаватая пена. Я хацеў зачарпнуць трохі, каб умыцца, але не наважыўся. Пабаяўся: раптам на твары балячкі зьявяцца. Ці наогул скура зьлезе. Нахіліўся над вадой, каб паглядзець на свой твар – але вада задрыжэла ад раптоўнага ветру, і я так нічога і не пабачыў.

«Ну яе! Мы ў гэтай рэчцы ледзь не патанулі, – сказаў Анцік. – І ніякая гэта ня рэчка. А проста нейкая мёртвая лужына, глыбокая, небясьпечная і брудная».

«Але да берага даплыць было можна, – сказаў я. – Калі б некаторыя ўмелі плаваць…»

«Вось бы зараз ванну, – уздыхнуў Анцік. – Цёплую… А ня гэтую канаву».

«Можа, табе яшчэ і качачку гумовую хочацца? – раззла-

валася Юля. – Маленечкі ты наш. Перастань яе крыўдзіць!»

«Каго? Раку? – крыкнуў Анцік. – Рэкі не крыўдуюць! Вось зараз вазьму і плюну ў яе!»

«Я табе плюну, – сказала Юля, і вочы ў яе ўспыхнулі ад злосьці. – Глядзі, каб яна ня плюнула ў адказ!»

«Ну і цалуйся са сваёй рэчачкай!» – махнуў рукой Анцік і вусны яго задрыжалі.

«Ціха вы, – сказаў я. – Нам нельга сварыцца, як вы не разумееце?»

«Рака нас уратавала, – ціха сказала Юля. – Памятаеш, уначы, калі наш аўтобус тануў? Нехта быццам бы прыўзьняў аўтобус над вадой. Р-раз – і мы паплылі, як на караблі».

«Памятаю, – змрочна кіўнуў я. – Але, можа, гэта проста…»

«Што проста?»

«Ня ведаю».

«Ты ж бачыш, Лявон, што загадак усё больш! Давай падумаем, што рабіць. А дзе Анцік?»

Вакол нас былі толькі туман і рака, такая ціхая, нібы прыслухоўвалася да нашай размовы. Мы зь Юляй пераглянуліся і кінуліся ў розныя бакі, проста ў гэтыя белыя клубы, што нерухома навісалі ў нас над галовамі. «Анцік!» – крычалі мы ўсё больш гучна. А потым я ўжо ня ведаў, у якім баку Юля, у якім аўтобус, у якім рака – вакол мяне былі толькі белыя сьцены з завітушкамі, і я праходзіў скрозь іх, як у казцы, і натыкаўся на ўсё новыя і новыя…

Туман. У горадзе ён быў зусім не такі. Там, дома, на вуліцы, дзе я жыў, хадзіць у тумане было нават забаўна. Дый сам туман там быў бяскрыўдны, празрысты, лёгкі і хутка сплываў – хіба што пераходзіць дарогу трэба было асьцярожней, чым звычайна. Але ў гэтым дзіўным месцы, куды мы трапілі, туман валадарыў, туман зьбіваў з тропу і блытаў усе сьляды. Я ішоў, сам ня ведаў, куды, выставіўшы наперад рукі, як нейкі туманоід, і адчуваў, што ў мяне пачынаецца паніка. Што калі я заблудзіў і застаўся зусім адзін?

І тут я пачуў плач і адразу супакоіўся.

«Анцік! Дзе ты?»

«Тут», – пачуў я ягоны засмучаны бас.

«Дзе?»

«А ты дзе?»

«Тут».

«Справа ці зьлева?»

«Адкуль я ведаю».

«Ты ж разумны!»

Я пачырванеў. Так мне зрабілася прыемна.

«Давай я буду крычаць, а ты ідзі на крык, – сказаў Анцік. – Я пачынаю. А-а-а-а!»

Я зачапіўся за нешта нагой і паваліўся проста Анціку пад ногі.

«А-а-а! – закрычаў ён яшчэ мацней. – Лявон, на мяне нехта напаў!»

«Хто?» – крыкнуў я.

«Нехта схапіў мяне за ногі!»

«Гэта я, – сказаў я, падняўся проста перад ім і прыкрыў ягоны разяўлены рот. – Ты што, ня бачыш?»

«А дзе Юля?» – прамычаў ён.

«Ня ведаю…»

Я прыбраў руку. Мы прыселі на мокрую траву, у роспачы пазіраючы адзін на аднаго.

«Ну і ну, – сказаў я. – Здаецца, нам цяпер трэба прывязацца вяроўкай, усім траім. Каб больш не губляцца. Вось адшукаем Юлю і…»

«Добрая ідэя, – сказала Юля, выходзячы з туману, як здань. – Прапаную яшчэ прывязаць да нас аўтобус. Толькі яго таксама трэба яшчэ знайсьці».

«Нейкая краіна туманаў, – сказаў Анцік. – Можа, мы ўжо даўно за мяжой?»

«Не кажы глупстваў», – сказала Юля, прынюхваючыся, нібы драпежніца, да ляснога паветра.

«Хіба ў нас бываюць такія жахлівыя туманы? – спытаў Анцік. – Скажы, Лявон? Гэта, напэўна, польскі туман. Бываюць жа польскія грыбы. Значыць, і туман бывае».

«Ён хутка разыдзецца, – сказаў я. – Вось пабачыш. Проста яшчэ занадта рана. Удзень ад яго нічога не застанецца. Нічагусенькі. І мы спакойна знойдзем дарогу».

«Можа быць, можа быць, – з сумневам прамовіла Юля. – Але давайце спачатку знойдзем аўтобус. Там можа быць штосьці карыснае. Ежа або мабільны тэлефон. І наогул: там

цяплей».

«Давай мне руку, – сказаў я і схапіў Анціка за запясьце. – Вось так. А другой я вазьму Юліну… Так мы, прынамсі, нікога ня згубім».

Юліна рука была ледзяная. Я рушыў налева, хоць зусім ня ведаў, куды ісьці, а Юля гэтак жа рашуча рушыла направа. Анцік павіс на мне і засьмяяўся, ды і я ўсьміхнуўся. Мы спыніліся.

«Не, так ня пойдзе, – сказаў я. – Давайце спачатку прыдумаем, куды ісьці. Я лічу, што аўтобус дзесьці…»

# Конец ознакомительного фрагмента.

Текст предоставлен ООО «ЛитРес».

Прочитайте эту книгу целиком, купив полную легальную версию на ЛитРес.

Безопасно оплатить книгу можно банковской картой Visa, MasterCard, Maestro, со счета мобильного телефона, с платежного терминала, в салоне МТС или Связной, через PayPal, WebMoney, Яндекс.Деньги, QIWI Кошелек, бонусными картами или другим удобным Вам способом.